Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

Институт истории Национальной академии наук Беларуси

# 1917 ГОД В ИСТОРИЧЕСКИХ СУДЬБАХ НАРОДОВ БЕЛАРУСИ

*Материалы Международной научно-теоретической конференции*

*г. Минск, 22 декабря 2017 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Минск
БГПУ
2017

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Т936

Печатается по решению Совета исторического факультета БГПУ

Редколлегия:
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Касович (отв. ред.);*
кандидат исторических наук, доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук, доцент *А. А. Корзюк*

Рецензенты:
доктор исторических наук, профессор *А. П. Житко;*
доктор исторических наук, профессор *А. М. Лютый*

**1917 год** в исторических судьбах народов Беларуси : материалы
Т936 Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 252 с.
ISBN 978-985-541-414-9.

В сборнике представлены материалы исследований ученых Беларуси, России, Казахстана, Туркменистана, студентов, магистрантов, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные 100-летию Октябрьской революции.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-414-9**

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 39337.
7. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 39463.
8. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 38. – 1863. – Отд. 1. – № 40172.
9. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 38. – 1863. – Отд. 2. – № 40145.
10. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 41. – 1866. – Отд. 1. – № 43212.
11. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). – Ф. 1291. Воп. 33. 1868 г. Спр. 34.
12. РДГА. – Ф. 1291, оп. 33, 1865 г., д. 531.
13. Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян-собственников в Северо-западном крае. – Вильна : Тип. Штаба Вилен. воен. окр., 1864. – [2], VI, 150 с.

# ПРАПАНОВЫ МІНСКАГА ТАВАРЫСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ПА ЛІКВІДАЦЫІ СЕРВІТУТАЎ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

***Талмачова С. А.,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, г. Мінск*
***Рубцова В. І.,*** *настаўнік гісторыі і грамадазнаўства, ДзУА «Гімназія № 40 г. Мінска»*

Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі было створана ў 1876 г. з мэтай садзейнічання развіццю аграрнага сектара эканомікі губерні. На пасяджэннях арганізацыі вырашаліся важныя пытанні эканамічнага жыцця рэгіёна. Адным з іх была праблема існавання сервітутаў, якія вельмі шкодна адбіваліся на стане гаспадаркі.

Сервітутнае права – пэўнае права сялян на бясплатнае сумеснае карыстанне лугамі, пашамі, лясамі памешчыка. Напрыклад, права на пасьбу жывёлы на ўладальніцкіх землях мелі сяляне больш чым у 1000 маёнткаў Мінскай губерні [1, с. 1]. Ліквідаваць сервітут можна было толькі па дабрачынным пагадненні, але сяляне не імкнуліся пазбавіцца сваіх праваў на бясплатнае карыстанне памешчыцкімі землямі. Заканадаўствам 19 лютага 1861 г. былым прыгонным сялянам давалася права на выкуп ворыўных і сядзібных земляў, а ўсе астатнія ўгоддзі, так неабходныя для вядзення гаспадаркі, заставаліся ва ўласнасці памешчыкаў. Але ў выніку паўстання 1863–1864 гг. сервітутнае права на тэрыторыі Беларусі было адноўлена дзеля прыцягнення сялянства на бок урада. Пры гэтым у дакументах на зямлю толькі ў рэдкіх выпадках былі дакладна адзначаны межы сервітутаў. Памешчыкі не маглі ў поўнай меры распараджацца землямі свайго маёнтку, на якія распаўсюджвалася сервітутнае права. На рубяжы XIX–XX стст. праблема узаемаадносін сялян і землеўладальнікаў набыла асаблівую вастрыню [2].

Мінскае грамадства сельскай гаспадаркі стварыла спецыяльную камісію для распрацоўкі праекта «разверстания сервитутов». У яе склад увайшлі буйныя землеўладальнікі і ўплывовыя дзеячы губерні – граф К. Чапскі, К. Гардзялкоўскі, Е. Любанскі, Б. Ратынскі, К. Незабытоўскі, І. Кукевіч і С. Багдашэўскі. Старшынёй быў абраны У. Масальскі [1, с. 8]. У выніку працы камісія прыйшла да высновы, што захаванне

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

названага права з'яўляецца адной з галоўных перашкод для развіцця сельскай і лясной гаспадаркі як уладальніцкай, так і сялянскай. Таму камісія вырашыла хадайнічаць ад імя Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі перад міністрам земляробства і дзяржаўных маёмасцей аб заканадаўчым вырашэнні меркаванай урадам меры абавязковага размежавання ўсіх відаў пашавага сервітуту, прадстаўленага сялянам у прыватнаўласніцкіх маёнтках. Прапанавалася перадача пэўнай колькасці памешчыцкай зямлі ў поўную ўласнасць сялян. Пры распрацоўцы праекта камісія кіравалася галоўным прынцыпам – магчыма справядлівага вызначэння нормы кампенсацыі сялянам пры ліквідацыі сервітутаў [1, с. 1–2].

У выніку былі прапанаваны наступныя меры. Зыходзячы з таго, што пашавы сервітут на летні перыяд даваўся сялянам пры надзяленні зямлёй для такой колькасці жывёлы, якую кожны з сялян-гаспадароў двара мог пракарміць узімку спецыяльна нарыхтаваным улетку кормам (сенам ці саломай), то сяляне пры адмежаванні сервітутаў павінны атрымаць ва ўласнасць столькі пашаў, каб мець магчымасць пракарміць на працягу летняга перыяду падножным кормам такую ж колькасць жывёлы. Таму, перш за ўсё, неабходна было вызначыць, колькі на поўным надзеле, які складаўся з зямлі пад раллё і сенажаць, можна было пракарміць жывёлы ўзімку, і колькі для такой жа колькасці жывёлы неабходна пашы ўлетку. Дзеля гэтага трэба было абмеркаваць: 1) колькі сухога корму (сена і саломы) неабходна для ўтрымання адной галавы жывёлы на працягу паўгоддзя; 2) якая колькасць чыстага выгану трэба для яе пракармлення на падножным корме на працягу другога паўгоддзя; 3) колькі сухога корму можа быць нарыхтавана з поўнага зямельнага ўчастка. Такім чынам прапанавалася вызначыць, колькі для кожнага надзела трэба даць чыстай бязлеснай пашы [1, с. 2].

Ва ўсіх выпадках абавязковага развярстання колькасць надзеленай сялянам зямлі павінна была быць прынята не па лічбах выкупнога акта, а па лічбах, вызначаных пры выкананні інструментальнага вымярэння па законе 26 сакавіка 1869 г. аб абавязковым адмежаванні сялянскай зямлі [3]. Па меркаванні членаў камісіі, з вылічанай такім чынам колькасці зямлі, якая перадавалася сялянам у якасці кампенсацыі за ліквідацыю сервітутнага права, трэба было адняць выганы і пашы, перададзеныя сялянам бязвыплатна пры складанні выкупных актаў. Такім чынам, сяляне атрымалі б «справедливое земельное вознаграждение», якое дало б ім магчымасць працягваць вядзенне сваёй сельскай гаспадаркі «без стеснения и неудобств». Пры гэтым зямля, якая перадавалася сялянам, павінна была быць «освобождена владельцем от растущаго на ней леса и отдана им в чистом виде», таму што ўсе прыведзеныя вышэй разлікі адносіліся да чыстых пашаў [1, с. 4–5].

Аднак такія разлікі нельга было прымяніць для ўсіх маёнткаў, дзе існавалі сервітуты. Па-першае, не ва ўсіх маёнтках былі такія вялікія пашавыя сервітуты, каб можна было вызначыць неабходную колькасць дзесяцін ў адпаведнасці з велічынёю сялянскіх надзелаў. Па-другое, у так званых палявых паветах часта былі невялікія



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прасторы ўладальніцкіх земляў пад сервітутамі. Таму пры норме вылічэння кампенсацыі сялянам за сервітут у 1/8 часткі надзела сялян часта атрымоўвалася, што ўсёй сервітутнай часткі маёнтку не хапіла б для надзялення сялян зямлёй, ці ўладальніку засталася толькі малая частка зямлі. Пры гэтым камісія адзначала, што ў такіх мясцовасцях сервітутнае права не поўнасцю забяспечвала сялянскую жывёлу падножным кормам. У адных выпадках сяляне раней ужо атрымалі пэўныя землі пад выганы і пашы, а сервітутнае права было пакінута як дапамога для пасьбы, у другіх – проста таму, што ў самога землеўладальніка не было іншай пашы. У падобных мясцовасцях камісія лічыла мэтазгодным іншы спосаб вылічэння. Трэба было перадаць сялянам тую частку зямлі пад сервітутам, якая б пасля «снятия леса» дала б такую колькасць корма, якую давала ўсё «сервитутное пространство». Гэтае меркаванне было заснавана на вопыце – пасля высечкі лесу ўкосы павышаліся ў 4–8 разоў, а адна дзесяціна пашы замяняла па колькасці кармавой травы 6 дзесяцін леса [1, с. 6]. Такім чынам, там, дзе 1/8 сялянскага надзела перавышала 1/6 частку сервітутнай прасторы, прапанавалася аддаваць сялянам толькі адпаведную апошнюю частку.

У цэлым камісія сцвярджала, што неабходна ўсталяваць адзіную агульную норму кампенсацыі з указаннем магчымых выключэнняў у бок паніжэння ці павышэння. Адсутнасць адзінай нормы магла прывесці да таго, што, па-першае, меркаванні членаў розных устаноў, якія займаліся б ліквідацыяй сервітутаў, маглі быць неаднолькавымі і часам памылковымі. Па-другое, члены камісіі апасаліся, што сяляне не зразумеюць закон і будуць адшукваць для сябе больш выгадныя ўмовы ўсталявання нормы кампенсацыіі. Такім чынам, у пачатку ХХ ст. немагчыма было ўстанавіць, на якой дакладна частцы памешчыцкай зямлі сяляне ў час выхаду на выкуп карысталіся сервітутамі. Пры такіх умовах узнікалі праблемы пры вызначэнні кампенсацыі сялянам пры ліквідацыі сервітутаў, як таго патрабаваў закон ад 26 сакавіка 1869 г. Гэтым тлумачыцца, з аднаго боку, вялікая разнастайнасць прапанаваных у свой час мясцовымі ўстановамі спосабаў і ўмоў ліквідацыі сервітутаў, а з другога – тое, што, нягледзячы на шматгадовую распрацоўку пытання, яно так і не было канчаткова вырашана на заканадаўчым узроўні.

***Літаратура***


1. Журнал комиссии, избранной Минским обществом сельского хозяйства, для разработки вопроса о разверстании сервитутов. – Минск: Паровая типо-лит. Х.Дворжец, [1894]. – 8 с.
2. Талмачова, С. Праблема сервітуту на тэрыторыі Беларусі ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. / С.Талмачова // Беларусь, Нясвіжскі край і Эдвард Вайніловіч: матэрыялы навук.-практ. канф., г. Нясвіж, 26 жніўня 2016 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2016. – С. 185–205.
3. ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 44. – 1869. – № 46901.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ